**Гарбачоў, М**. Па працы і пашана / М. Гарбачоў // Лепельскі край. — 2009. — 3 крас. — С. 1.

# ПА ПРАЦЫ І ПАШАНА



Кацельня ў Матырыне адносіцца да структурнага падраздзялення КУВП "Бароўка", ацяпляе памяшканні мясцовай сярэдняй школы, дзіцячага садка і кватэр жыллёвай забудовы.

– У якасці паліва выкарыстоўваем дровы, – гаворыць машыніст Уладзімір Машара. – Усяго працуе пяць чалавек. Пасля заканчэння ацяпляльнага сезона рамантуем абсталяванне, таксама вырабляем дэкаратыўную агароджу, удзельнічаем у выкананні самых розных будаўнічых работ.

Уладзімір Машара – дысцыплінаваны работнік, добрасумленна выконвае свае абавязкі, – сказаў майстар вытворчага участка аграгарадка Яўген Цыўнель. – З такімі, як ён, можна выконваць любыя вытворчыя задачы. Невыпадкова сёлета ён за высокія працоўныя дасягненні ўзнагароджаны Ганаровай граматай райвыканкама.

Пацікавіўся ва Уладзіміра Машары, як ён, ураджэнец вёскі Мосар Глыбоцкага раёна аказаўся на Лепельшчыне.

– У 1986–1988 гадах служыў у арміі. Некалькі месяцаў правёў у «вучэбцы» ў сярэднеазіяцкай Кушцы, а затым адзін год і восем месяцаў выконваў інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане. У якасці вадзіцеля прымаў удзел у баявых аперацыях, неаднаразова трапляў пал кулі «душманаў». Спазнаў, што такое сапраўдная вайна, баявое сяброўства і ўзаемадапамога паміж воінамі.

Пасля дэмабілізацыі ўладкаваўся на працу вадзіцелем у саўгас «Баброва». Ажаніўся. Паколькі жонка Іна працавала загадчыцай гаспадаркі ў Матырынскай сярэдняй школе, давялося зноў змяніць месца жыхарства. Зараз жывём у доме, які пабудаваў мясцовы саўгас. У падсобнай гаспадарцы трымаем карову, каня, курэй. Штогод засяваем больш 20 сотак зямлі бульбай, іншай гароднінай.

Добрым памочнікам ва ўсіх справах па гаспадарцы з'яўляецца сын Уладзіслаў. Сёлета ён ужо заканчвае адзінаццаты клас Матырынскай сярэдняй школы.

– Як праводзіце вольны час, ці ёсць якія асабістыя захапленні?

– Я – заўзяты аматар рыбалкі. Калі выпадае вольная часіна, люблю на спінінг улетку і з дапамогай жэрліц у зімовы час палавіць шчупакоў. Выкарастоўваю і іншыя дазволеныя рыбалоўныя прылады. Вельмі захапляльнай бывае таксама здабыча ляшча, карася, іншай рыбы. Заўсёды прыемна адпачыць на прыродзе, узняць жыццёвы настрой, каб з новымі сіламі прыступіць да працы.

**М. Гарбачоў**